11. Статистический ежегодник России 1914 г. (год одиннадцатый) / Центр. стат. ком. М.В.Д. – Петроград : Тип. Штаба Петрогр. Воен. окр., 1915. – XVIII, 679 с.
12. Экономика Белоруссии в эпоху империализма (1900–1917) / Под ред. Г. Т. Ковалевского [и др.]. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1963. – 423 с.

УДК [94(476)+338.24.021.8.(476)(091)]"17/18"

# МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII – ПАЧАТКУ XIX стст.

**В. Ф. Голубеў**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, v_goloubeu@mail.ru*

Другая палова XVIII ст. у Беларусі, як і ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім характарызуецца мадэрнізацыйнымі змяненнямі ў сацыяльна-эканамічнай сферы. Пра гэта сведчыць стварэнне Скарбавай камісіі ВКЛ як дзяржаўнага органа па кіраванню эканомікай, удасканаленне заканадаўства па эканамічных пытаннях, дазвол шляхце займацца рамяством і гандлем. Спробамі мадэрнізацыі эканомікі былі аграрная і мануфактурная рэформы А. Тызенгаўза, рэформы, накіраваныя на вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці і прадастаўленне ім пэўнай эканамічнай свабоды, якія праводзілі ў сваіх уладаннях П. Бжастоўскі, І. Храптовіч, І. Масальскі і іншыя прыхільнікі ідэй фізіякратаў. Развіццё вотчыннага прамысловага прадпрымальніцтва ў магнацкіх маёнтках сведчыла пра іх інтэнсіфікацыю і мадэрнізацыю. Але згаданыя спробы мадэрнізацыі не сталі ў разглядаемы час вызначальнымі на тэрыторыі Беларусі, другая палова XVIII – пачатак XIX стст. сталі толькі пачаткам пераходнага перыяду ад феадалізму да капіталістычнага ўкладу.

***Ключавыя словы:*** Асветніцтва; Вялікае Княства Літоўскае; Беларусь; мадэрнізацыя; сельская гаспадарка; фізіякраты; эканоміка.

# МОДЕРНИЗАЦИОННЫЕ ПРОЦЕССЫ В СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ЖИЗНИ БЕЛАРУСИ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XVIII – НАЧАЛА XIX вв.

**В. Ф. Голубев**

*Институт истории Национальной академии наук Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, v_goloubeu@mail.ru*

Вторая половина XVIII в. в Беларуси, как и во всем Великом Княжестве Литовском характеризуется модернизационными изменениями в социально-экономической сфере. Об этом свидетельствует создание Скарбовой комиссии ВКЛ как государственного органа по управлению экономикой, совершенствование законодательства по экономическим вопросам, разрешение шляхте заниматься ремеслом и торговлей. Попытками модернизации экономики стали аграрная и мануфактурная реформы А. Тызенгауза, реформы, направленные на освобождение крестьян от крепостной зависимости и предоставление им некоторой экономической свободы, которые проводили в своих имениях

П. Бжостовский, И. Хрептович, И. Масальский и другие сторонники идей физиократов. Развитие вотчинного промышленного предпринимательства в магнатских имениях свидетельствовало об их интенсификации и модернизации. Но упомянутые попытки модернизации не стали решающими на территории Беларуси в рассматриваемое время, вторая половина XVIII – начало XIX вв. стала лишь началом переходного периода от феодализма к капиталистическому укладу.

***Ключевые слова:*** Просвещение; Великое Княжество Литовское; Беларусь; модернизация; сельское хозяйство; физиократы; экономика.

## MODERNIZATION PROCESSES IN THE BELARUS SOCIO-ECONOMIC LIFE IN THE SECOND HALF OF THE 18th – EARLY 19th CENTURIES

**V. F. Holubeu**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Academicheskaya, 1, 220072, Minsk v_goloubeu@mail.ru*

Second half of the 18th century in Belarus, as well as throughout the Grand Duchy of Lithuania, was characterized by modernization changes in the socio-economic sphere. This is evidenced by the creation of the Grand Duchy of Lithuania Skarb Commission as a state body for economic management, the legislation improvement on economic issues, and permission for the gentry to engage in crafts and trade. Attempts to modernize the economy were the agrarian and manufacturing reforms of A. Tyzengauz, reforms aimed at liberating peasants from serfdom and giving them some economic freedom, which were carried out on their estates by P. Brzostovsky, I. Khreptovich, I. Masalsky and other physiocrats ideas supporters. The development of patrimonial industrial entrepreneurship in nobleman estates testified to their intensification and modernization. But the mentioned attempts at modernization did not become decisive on the Belarus territory at the time in question, the second half of the 18th century – the beginning of the 19th century was only the beginning of the transition period from feudalism to the capitalist structure.

***Keywords:*** Enlightenment; Grand Duchy of Lithuania; Belarus; modernization; agriculture; physiocrats; economics.

У беларускай гістарыяграфіі склалася дастаткова ўстойлівая традыцыя лічыць, што мадэрнізацыйныя працэсы на беларускіх землях пачаліся толькі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст., пасля ўключэння тэрыторыі Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Падаецца, што толькі А. Ю. Латышонак і І. Ф. Кітурка выказаліся пра тое, што тэрмін «мадэрнізацыя» у поўнай меры можа быць выкарыстаны і пры характарыстыцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVIII ст. [12. С. 109–126; 5. С. 97–104; 6. С. 47–56; 7. С. 17–20].

Калі ўлічваць, што тэрмін «мадэрнізацыя» паходзіць ад французскага слова moderne, што азначае «сучасны», «найноўшы», і тое, што пад мадэрнізацыяй звычайна маецца на ўвазе працэс абнаўлення ў адпаведнасці з новымі, сучаснымі патрабаваннямі, то гісторыкі мадэрнізацыяй могуць

назваць практычна любыя рэформы (ці перыяды рэформ), якія праводзіліся ў любы час у эканамічнай, сацыяльнай ці палітычнай сферах. У такім сэнсе сапраўднай мадэрнізацыяй, першай па землях Беларусі, можна было б назваць комплекс рэформ, праведзеных у XVI ст., у аснове якіх была вялікая аграрная рэформа (валочная памера) [1. С. 28–34; 2. С. 11–24].

Аднак у беларускай гістарыяграфіі тэрмінам «мадэрнізацыя» звычайна карыстаюцца вучоныя, якія разумеюць пад гэтай з'явай эканамічныя пераўтварэнні напрамую звязаныя з развіццём на беларускіх землях капіталістычных адносін. З. В. Шыбека звязваў з мадэрнізацыяй і дзяржавабудаўнічыя і нацыятворчыя працэсы, што адбываліся на беларускіх землях у XIX–XX стст. [15. С. 49–50].

Пры ўважлівым разглядзе падставаў, на аснове якіх ужываецца тэрмін мадэрнізацыя адносна беларускага мінулага, у тым ліку і адносна сацыяльна-эканамічныга развіцця, выразна відаць, што на першы план выходзяць не эканамічныя ці палітычныя складнікі, а традыцыйны падзел гісторыі Беларусі на пэўныя перыяды. Пераважаюць тут два падыходы: альбо фармацыйны (першабытнае, рабаўладальніцкае, феадальнае і капіталістычнае грамадства), альбо перыядызацыя паводле знаходжання Беларусі ў складзе тых ці іншых дзяржаўных утварэнняў (Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя, СССР). У сувязі з гэтым лічыцца паводле існуючых яшчэ з савецкіх часоў перакананняў, што радыкальных змяненняў, а значыць і мадэрнізацыі пры феадалізме апрыёры быць не магло. Прыблізна такая ж ацэнка ў беларускай гістарыяграфіі застаецца і да часоў знаходжання Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай. Лічыцца, што апошняя як быццам толькі і рабіла, што дэградавала (асабліва с сярэдзіны XVIII ст., у перыяд перад падзеламі краіны) ў сацыяльна-эканамічным і палітычным сэнсе і таму адносна яе ні пра якую мадэрнізацыю гаварыць не прыходзілася.

Выказванні сучасных беларускіх гісторыкаў, якія прафесійна вывучаць пытанні сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Рэчы Паспалітай і Беларусі ў яе складзе ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст. (А. У. Мацук, І. Ф. Кітурка і інш.) [13. С. 487–503; 9. С. 42–58; 10. С. 503–525] пра наяўнасць радыкальных зменаў у многіх сферах жыцця гэтай дзяржавы ў абазначаны перыяд, пра якраз мадэрнізацыйныя падыходы, на жаль не сталі пакуль агульнапрынятымі ў беларускай гістарыяграфіі.

Неперакана ўчымі, на наш погляд, з'яўляюцца і сцвярджэнні, што прагрэсіўныя з'явы (мадэрнізацыя) найперш у эканоміцы пачалі адбывацца на тэрыторыі Беларусі менавіта пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай 1772, 1793 і 1795 гг. Атрымліваецца, што да гэтых дат гаспадарка і грамадства не развіваліся, а гаспадарка заходняга і цэнтральнага рэгіёнаў Беларусі пасля 1772 г. больш за 20 гадоў стаяла на месцы чакаючы, калі да іх «прыйдзе»

мадэрнізацыя. Пра тое, што гэта не так, пераканаўча сведчыць, напрыклад, дзейнасць некаторых агульнадзяржаўных соймаў, інтэнсіўнае развіццё многіх магнацкіх, і не толькі, гаспадарак, размешчаных у заходняй і цэнтральнай Беларусі.

Разам з тым, прыкладаў пра радыкальныя змяненні, якія адбываліся ў другой палове XVIII ст. у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці Рэчы Паспалітай і Беларусі ў яе складзе даволі шмат. Так, калі не пра мадэрнізацыю, то пра спробы яе правядзення сведчаць рашэнні канвакацыйнага сойма 1764 г. на якім было вырашана не прымяняць права «ліберум вета» пры галасаванні па эканамічных пытаннях, а прымаць рашэнні простай большасцю галасоў. Была заснавана Скарбавая камісія ВКЛ – Эканамічная Рада Літоўскага скарбу, як дзяржаўны орган па кіраванню гаспадаркай, адменены ўнутрыдзяржаўныя гандлёвыя пошліны, уведзена адзіная для ўсёй краіны сістэма мераў і вагі і інш.

Несумненна, што спробай мадэрнізацыі экономікі ВКЛ былі знакамітыя аграрная і мануфактурная рэформы А. Тызенгаўза, праведзеныя ў дзяржаўных уладаннях у другой палове XVIII ст.

Імкненнем да зменаў, да перабудовы, да мадэрнізацыі была прасякнута праца Чатырохгадовага сойма 1788–1792 гг. Адно толькі рашэнне аб дазволе шляхце займацца рамяством і гандлем, прынятае на гэтым сойме, выразна сведчыць пра новыя, менавіта мадэрнісцкія падыходы да арганізацыі гаспадарчага жыцця ў краіне. Былі значна пашыраны правы мяшчан, а «Ustawa rządowa», больш вядомая як Канстытуцыя 3 мая 1791 г. радыкальна змяніла сацыяльную і палітычную арганізацыю Рэчы Паспалітай, у тым ліку адмяніла даўнюю традыцыю выбарнасці манарха на соймах і ўстанавіла правіла спадчыннасці трона. Стваралісяя больш выгадныя ўмовы для развіцця мануфактурнай вытворчасці і гандлю і інш. Несумненна, што Канстытуцыя 3 мая ў сваёй аснове мела прагрэсіўны характар, стварала ўмовы да больш радыкальнай перабудовы ва ўсіх сферах жыцця. Мадэрнізацыйныя памкненні выразна назіраліся і ў дзеяннях Адукацыйнай камісіі.

У сувязі з вышэйсказаным падаецца прымальным вылучэнне ў якасці першага этапа «перыядызацыі гісторыі Беларусі ў эпоху мадэрнізацыі» перыяда сярэдзіны XVIII – 30-х гг. XIX ст., прапанаванае А. Ю. Латышонкам [12. С. 109–126]. Сярод асноўных характарыстык гэтага этапа А. Ю. Латышонак адзначыў наступнае: «феадальная гаспадарка з адпрацовачнай феадальнай рэнтай; з’яўленне мануфактураў і фабрык, мадэрнізацыя феадальных дзяржаўных грамадскіх (верхняй праслойкі) структураў; … Асветніцтва закранае верхнія пласты грамадства…» [12. С. 125].

Сапраўды, з улікам таго, што ў сярэдзіне – другой палове XVIII ст. пачалі адбывацца настолькі значныя змяненні ў эканоміцы і сацыяльна-

палітычным жыцці Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, гэты час з упэўненасцю можна вызначыць як першапачатковы этап мадэрнізацыі на беларускіх землях.

Неабходна адзначыць, што на пачатак мадэрнізацыйных памкненняў значна паўплывала стабілізацыя гаспадарчага жыцця ў ВКЛ. Да сярэдзіны XVIII ст. практычна завяршылася адбудова эканомікі Беларусі пасля разбуральных падзей Паўночнай вайны 1700–1721 гг. Збожжавая кан'юнктура на знешніх рынках нечым напамінала сітуацыю першай паловы – сярэдзіны XVI ст., калі значна ўзрос попыт на беларускае збожжа ў Еўропе. Рост попыту на прадукцыю сельскай гаспадаркі на ўнутраным рынку, выкліканы значным павелічэннем колькасці насельніцтва Беларусі (з 1,5 млн. чалавек у 1717 г. да 3,6 млн. чалавек у 1790 г.), а таксама пашырэнне экспарту збожжа ў еўрапейскія краіны, вялі да павышэння цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю.

Такім чынам, у другой палове XVIII ст. склаліся спрыяльныя ўмовы для продажу сельскагаспадарчай прадукцыі на знешнім і ўнутраным рынку, што стымулявала дзяржаву і прыватных уласнікаў да пашырэння панскага заворвання, да большай гаспадарчай спецыялізацыі сваіх маёнткаў.

Разам з тым даследчыкі адзначаюць, што да сярэдзіны XVIII ст. не проста завяршылася аднаўленне гаспадаркі пасля Паўночнай вайны і адбылося ажыўленне ва ўсіх сферах эканомікі. Гэта быў час значных змен у самой арганізацыі эканамічнага жыцця і нават у яго разуменні [5. С. 97].

На гаспадарчае і палітычнае жыццё ўсё большы ўплыў пачала аказваць сацыяльна-палітычная ідэалогія Асветніцтва, якая аддавала перавагу асвеце, навуцы і розуму ў жыцці асобы, грамадства, дзяржавы. Сярод прыярытэтаў Асветніцтва важнае месца займала так званая рацыянальная эканоміка, заснаваная на ідэях эканамічнага прагрэсу.

У сярэдзіне – другой палове XVIII ст. у гаспадарчым і сацыяльна-палітычным жыцці ВКЛ, як і ўсёй Рэчы Паспалітай усё больш выразна пачалі праяўляцца заходнееўрапейскія ўплывы, шырокае распаўсюджанне атрымала замежная літаратура па эканоміцы, найперш пераклады з англійскай і нямецкай мовы. І. Ф. Кітурка, напрыклад, адзначае, што «на тэрыторыі ВКЛ гаспадарчыя пераўтварэнні насілі інавацыйны характар як для развіцця прамысловасці, так і сельскай гаспадаркі, грунтаваліся на гаспадарчым досведзе еўрапейскіх дзяржаў і па сутнасці з'яўляліся першай спробай сапраўднай мадэрнізацыі краіны» [5. С. 97].

Найбольш прагрэсіўная і адукаваная частка грамадства разумела неабходнасць правядзення рэформ як у палітычнай, так і ў эканамічнай сферах. Самымі вядомымі з ліку буйных землеўладальнікаў Вялікага Княства Літоўскага на тэрыторыі Беларусі, якія кіраваліся ў сваёй палітычнай і гаспадарчай дзейнасці ідэалогіяй Асветніцтва і былі прыхільнікамі ідэй

французскіх фізіякратаў, з'яўляюцца Іахім Храптовіч і Ігнат Масальскі. Яны лічылі паншчыну прыніжэннем чалавечай асобы і пераводзілі сялян сваіх уладанняў з «службы цяглай» на грашовую рэнту, умацоўвалі абшчынныя традыцыі ў сваіх маёнтках – уводзілі агульную адказнасць грамады за тых, хто па нейкіх прычынах не змог заплаціць чынш, падтрымлівалі звычаі сялянскай узаемадапамогі пры пажарах і ў іншых крытычных выпадках, ініцыіравалі стварэнне ў вёсках страхавых збожжавых складаў (магазінаў) і інш. Па ініцыятыве прыхільнікаў ідэй фізіякратаў адкрываліся школы для сялянскіх дзяцей, яны займаліся гаспадарчай адукацыяй і выхаваннем сялянства (прапагандавалі здаровы лад жыцця, тлумачылі шкоду, якую прыносіла празмернае ўжыванне гарэлкі і інш.). Больш за тое, імкнучыся арганізаваць «справядлівае жыццё» для сялян так, як яно ім бачылася, фізіякраты стваралі ў сваіх маёнтках спецыяльную сістэму кантроля жыцця сялянства, ніжнім звяном якой звычайна былі кантралёры-дзесятнікі, а завяршалася яна «сялянскімі судамі», дзейнасць якіх была рэгламентавана землеўласнікам [3. С. 207–230].

Рэформы, накіраваныя на вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці і прадастаўленне ім пэўнай эканамічнай свабоды, праводзілі ў сваіх уладаннях П. Бжастоўскі, І. Храптовіч, І. Масальскі і інш. Яны ж выступалі ў ролі ініцыятараў, фундатараў, а часам нават і аўтараў перакладаў замежных эканамічных выданняў [8. С. 165].

Так, у маёнтках падканцлера ВКЛ Іахіма Храптовіча Шчорсы і Нягневічы Наваградскага павета ў 1770-х гг. была праведзена рэформа, паводле якой сяляне вызваляліся ад паншчыны, атрымалі па 1/3 валокі ворыўнай зямлі на гаспадарку. За гэта яны павінны былі аддаваць трэцюю частку ўраджаю натурай, або грашыма па наваградскіх коштах. Даволі шырокімі былі паўнамоцтвы сельскай абшчыны: на грамаду ўскладвалася выплата дзяржаўных падаткаў, утрыманне шпіталя, лекара і аптэкі, грамадскага збожжавага страхавога склада («магазіна») і інш. У Шчорсах існавала тры фальваркі, зямля ў якіх апрацоўваліся мясцовымі сялянамі за адпаведную плату. Ураджайнасць збожжавых там была вельмі высокай [14. С. 134–137].

Рэформа І. Храптовіча значна пашырыла гаспадарчую самастойнасць сялянства, паказала перавагі наёмнай працы над паншчыннай, забяспечыла трохразовае павелічэнне даходаў з маёнткаў, дзе яна была праведзена. Такая сістэма арганізацыі працы праіснавала тут да 1861 г.

Вялікі пісар ВКЛ ксёндз Павел Ксаверы Бжастоўскі ў маёнтку Мерач (Паўлава), размешчаным у Трокскім павеце, амаль на мяжы з Гарадзенскім, у 1769 г. выдаў спецыяльную Уставу, аб'явіўшы, што галоўнай мэтай рэформы з'яўляецца паляпшэнне жыцця сялян, заснаванае на існаванні дакладна вызначанага і стабільнага павіннаснага і падаткавага абкладання.

Уставай рэгуляваліся амаль усе бакі жыцця сялян і местачкоўцаў (уводзілася пяцьдзесят адна павіннасць, якія былі абавязковымі для выканання). Стваралася дакладная сістэма адміністрацыйнага кіравання, якая ўключала ў сябе як панскіх чыноўнікаў, так і прадстаўнікоў сялян: губернатар – намеснік губернатара (пісар) – дворны цівун – цэнзар – бурмістр – лаўнікі (два) – арандатары, якія трымалі прапінацыю – ляснічыя (два) – мастаўнічыя (два) – дзесятнікі (па патрэбе). Устава прадугледжвала існаванне чатырох катэгорый сельскага насельніцтва (чыншавікі, баяры, цяглыя і кутнікі), якія ў штодзённым жыцці павінны былі насіць шапкі рознага колеру, каб адразу было відаць да якой катэгорыі селянін належыць. Уводзіўся дваровы суд, у склад якога ўваходзілі губернатар, намеснік, цівун, лаўнікі. Рашэнне прымаў губернатар, астатнія ўдзельнікі судовага працэсу мелі толькі права выказвацца па справе [4. С. 239].

Паводле Уставы для Паўлаўскай воласці 1791 г. уладанне падзялялася на чатыры дывізіі, кожная пад кіраўніцтвам цэнзара. У кожную дывізію ўваходзілі па чатыры войтаўствы на чале з дзесятнікам або войтам і паддзесятнікамі. Устава прадугледжвала наяўнасць у маёнтку школы і лекара. Вясковае насельніцтва атрымала права пакінуць маёнтак пры ўмове выплаты даўгоў і выстаўлення замены сабе [4. С. 240].

Прыкладам прымянення ідэй Асветніцтва ў беларускай вёсцы сталі некаторыя царкоўныя ўладанні, як маёнткі Ігумен Менскага павета і Убарць (Лельчыцы) Мазырскага павета віленскага біскупа Ігнацыя Масальскага, які займаў гэтую пасаду з 1762 г. І. Масальскі быў актыўным прадстаўніком ідэалогіі Асветніцтва, першым старшынёй Адукацыйнай камісіі (1773–1780 гг.). Ён выступаў за вызваленне сялян ад прыгону і адпаведную палітыку праводзіў у сваіх уладаннях. Мяркуем, што менавіта яго словы ўнесены ў Генеральную Уставу Убарцкай воласці, змешчаную ў інвентары 1776 г.: «Я хацеў бы, каб людзі, якія па волі Бога знаходзяцца пад маёй уладай, былі найшчаслівейшымі, але гэта немагчыма без асветы, таму даручаю дваровай адміністрацыі дабівацца, каб усе гаспадары праз любоў да свайго патомства аддавалі дзяцей зімоваю парою ў парафіяльныя школы для навучання адпаведным для свайго саслоўя навукам... каб павялічыць для кожнага магчымасці лёсу і даць ім поўную незалежнасць…» («Iest moim pragnieniem, ażeby Lud władzy moiey od Boga powierzoney, był nayszczęsliwszy, aże do tego przyiść nie może bez oświecenia, prze to obowiązuje y Dworzką zwierchność aby do skutku koniecznie staralisię przyprowadziś y wszystkich gospodarzow, ażeby przez milość swoje go potomstwa, oddawali one do szkoł Parafialnych zimową porą y gdy się tam wycwiczą w przyswoitych stanowi naukach... przez powiększenie każdego Fortuny y nadania mu zupelney wolności») [16. С. 19].

Сяляне ў гэтым уладанні выплачвалі чынш і мядовую даніну, а згодна з іншымі палажэннямі Уставы 1780 г. ім забяспечваліся свабода гандлю, магчымасць адукацыі дзяцей, абшчыннае самакіраванне, грашовая аплата за розныя віды працы на патрэбы двара і інш.

У інвентары Ігуменскай воласці Віленскага біскупства, складзеным каля 1788–1790 гг. падкрэслівалася, што сялянам далі свабоду ад паншчыны з умовай, каб яны «чыншам за ўсё адплацілі». Прадугледжвалася, што калі хто-небудзь не зможа заплаціць чынш, то гэта павінна будзе зрабіць за яго валасная грамада, а калі селянін не заплаціць і другі раз, то яго трэба ізноў зрабіць цяглым. Для ўзаемадапамогі сялянам быў створаны грамадскі зерневы склад («магазін») [4. С. 284–285].

Звяртае на сябе ўвагу значна больш актыўны, чым у папярэднія перыяды ўдзел дзяржаўных інстытутаў у эканамічным жыцці краіны. Гэта найперш стварэнне Эканамічнай Рады Літоўскага скарбу і ўвядзенне «лепшага кіравання і гаспадарання» [17. S. 75–78], прапаганда і падтрымка гаспадарчых рэформаў, у тым ліку і аграрнай і мануфактурнай рэформаў А. Тызенгаўза якія праводзіліся ў дзяржаўных уладаннях. Спрыяла лепшаму развіццю эканомікі ўдасканаленне заканадаўства (найперш гаспадарчыя законы, прынятыя на канвакацыйным сойме 1764 г.), дазвол мяшчанам набываць маёнткі, а шляхце займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю і гандлем, паляпшэнне водных і сухапутных шляхоў зносін.

Значны ўплыў на гаспадарчае развіццё аказвалі новыя агранамічныя веды. П. Р. Казлоўскі адзначаў, што другая палова XVIII ст. стала часам распаўсюджвання ў Беларусі шматлікіх гаспадарчых інструкцый, якія падпісваліся магнатамі і былі прызначаны для выканання эканомам і адміністратарам уладанняў. У інструкцыях абагульняўся і прапагандаваўся народны вопыт і сучасныя дасягненні навукі. Некаторыя з такіх інструкцый былі выдадзены друкарскім спосабам. Агранамічныя веды папулярызаваліся ў перыядычным друку і ў кнігах па розных галінах сельскай гаспадаркі [11. С. 46].

Вучоныя звярнулі ўвагу на тое, што кнігі гаспадарчага зместу, перакладзеныя з англійскай, нямецкай, французскай моваў, выдаваліся ў другой палове XVIII ст. у друкарнях як на тэрыторыі Кароны, так і ў Вялікім Княстве Літоўскім, у тым ліку ў Вільні, Гародні, Нясвіжы, Берасці. Так, колькасць эканамічных выданняў у Рэчы Паспалітай павялічылася да 130 экзэмпляраў у параўнанні з канцом XVII ст., калі іх было толькі 25 [5. С. 99; 18. S. 28].

Пад уплывам новых ведаў у ВКЛ пачалі рэалізоўвацца шматлікія рэфарматарскія праекты. Звычайна іх праводзілі дастаткова заможныя людзі, найперш магнаты.

Аснову эканомікі ў гэты час па-ранейшаму складала сельская гаспадарка. Пасля завяршэння перыяду пасляваеннага аднаўлення, да сярэдзіны XVIII ст. умацаваліся не толькі панскія, але і сялянскія гаспадаркі. Больш за тое, узровень развіцця гаспадаркі сялян дасягнуў такой ступені, што ствараў магчымасці для вядзення пашыранай вытворчасці. Сям'я селяніна магла не толькі пракарміцца, але і вырабіць дадатковы прыбавачны прадукт, які забяспечваў выплату рэнты землеўласніку і з'яўляўся неабходнай умовай для развіцця рамяства і гандлю.

Гаспадарчая палітыка дзяржавы ў другой палове XVIII ст. была накіравана не проста на рэфармаванне. Ішоў пошук новых форм гаспадарання, а таксама шляхоў павышэння рэнтааддачы сялянства. Менавіта з такой мэтай у дзяржаўных уладаннях у сярэдзіне – другой палове XVIII ст. былі распачаты мерапрыемствы ўжо раней згаданай аграрнай рэформы Антонія Тызенгаўза.

Рэформа А. Тызенгаўза мела шмат падабенства з вялікай аграрнай рэформай сярэдзіны XVI ст. – валочнай памерай. Аднолькавай была ідэя перамеру ворыўных зямель, стварэння фальваркаў у якасці гаспадарак па вырошчванню збожжа на продаж, падзел сялян на катэгорыі паводле іх асноўных павіннасцей. Абедзве рэформы значна павялічылі даходы каралеўскага скарбу. Але пры гэтым павіннасны ціск у выніку рэформы А. Тызенгаўза ўзрос у некалькі разоў. Для параўнання, у час валочнай памеры паншчына вызначалася ў памеры 2 дні ў тыдзень з валокі, а ў другой палове XVIII ст. – 2 дні ў тыдзень з надзелу, г. зн., з 1/4 часткі валокі.

У выніку сяляне ў большасці сваёй не прынялі рэформу. Да 1780 г. у каралеўскіх эканоміях значна зменшылася колькасць насельніцтва і цяглавай жывёлы, у Гарадзенскай – на 7,7 % і 32 % адпаведна, што было хутчэй за усё вынікам уцёкаў сялян. Выгады скарбу аказаліся кароткачасовымі. Прымусовая праца пры адсутнасці зацікаўленасці работніка ў яе выніках была малаэфектыўнай, тым больш у параўнанні з папярэдняй палітыкай гаспадарчых ільгот для сялянства.

Такім чынам, не ўсе новаўвядзенні былі эффектыўнымі. Разам з тым, негатыўны вопыт, набыты пад час ажыццяўлення аграрнай рэформы А. Тызенгаўза, быў улічаны ў далейшай гаспадарчай рэарганізацыі дзяржаўных маёнткаў. У 1780 г. памеры паншчыны для сялян дзяржаўных эканомій былі паменшаны, пастунова расла колькасць чыншавых гаспадарак.

Але трэба прызнаць, што згаданыя спробы мадэрнізацыі ў сферы сельскагаспадарчай вытворчасці не сталі на тэрыторыі Беларусі вызначальнымі. На прыватнаўласніцкіх землях, удзельная вага якіх у структуры феадальнага землеўладання ў другой палове XVIII ст. складала амаль 80 %, традыцыйна панаваў фальварак. Разам з тым, многія землеўласнікі

імкнуліся дзеля павышэння даходнасці сваіх маёнткаў па-новаму арганізаваць фальваркавую гаспадарку, рацыяналізаваць яе, усталяваць па-новаму адносіны з сельскім насельніцтвам аж да рэгламентацыі вясковага жыцця, заахвочвання працавітых і пакарання нядбайных падданых, арганізацыі вясковых судоў і інш.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што пачаткам новага этапу развіцця эканомікі Беларусі, першых спробаў мадэрнізацыі можнесумненна можна лічыць 1764 г., калі да ўлады ў Рэчы Паспалітай прыйшла партыя рэфарматараў, якія аб'ядналіся вакол новага караля і вялікага князя Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У гэты час на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца ідэалогія Асветніцтва, для якой была, між іншым, характэрнай прапаганда свабоды асобы, ідэя забеспячэння хаця б мінімальных сацыяльных і гаспадарчых умоў жыцця ўсім людзям, у тым ліку і сялянам. Разам з тым, пытанне аб вызваленні сялянства ад прыгоннай залежнасці не стаяла. Разуменне асабістай свабоды для сялян прадстаўнікамі пануючага класа, як правіла, зводзілася да магчымасці адмены паншчыны і замены яе грашовай рэнтай. Галоўным для землеўласнікаў заставалася пытанне павышэння прыбытковасці іх маёнтка.

Такім чынам, аналіз становішча ў эканоміцы, найперш у сельскай гаспадарцы Беларусі паказвае, што другая палова XVIII ст. стала пачаткам пераходнага перыяду ад феадалізму да капіталістычнага ўкладу. Фальваркава-паншчынная сістэма ўжо не магла забяспечыць задавальняючага ўзроўню развіцця эканомікі, што адчулі і на што вымушаны былі рэагаваць землеўласнікі. У 80-я г. XVIII ст. адбылася карэляцыя кірункаў у гаспадарчай палітыкі дзяржавы ў бок паслаблення падаткава-павіннаснага абкладання, змяншэння памераў паншчыны, павышэння долі грашовай рэнты ў складзе сялянскіх павіннасцей. У некаторых магнацкіх гаспадарках назіраецца перавод на чынш сялян, прымяненне наёмнай працы. Буйныя землеўласнікі імкнуліся інтэнсіфікаваць сельскую гаспадарку. Яны рацыяналізавалі догляд за жывёлай, рэгулявалі дозы ўнясення ўгнаенняў, прымянялі палепшаную агратэхніку, што павышала ўраджайнасць. Магнацкая гаспадарка з аднагаліновай (зерневай) у другой палове XVIII ст. стала ператварацца ў шматгаліновую, хаця вытворчасць зерня ўсё яшчэ пераважала. Разам з тым, нягледзячы на пашырэнне таварна-грашовых адносін, у краіне працягвала існаваць прыгоннае права, а асноўнай формай вытворчасці ў феадальных уладаннях заставаўся фальварак. Разам з тым, менавіта ў другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі адбыліся першыя спробы мадэрнізацыі сацыяльна-эканамічнага жыцця.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Голубеў, В. Ф.* Рэформа кіравання дзяржаўнымі ўладаннямі ў ВКЛ у XVI ст. / В. Ф. Голубеў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 3. – С. 28–34.

2. *Голубеў, В. Ф.* Вялікая аграрная рэформа XVI ст. – першая спроба комплекснай перабудовы ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі / В. Ф. Голубеў // Сельское хозяйство Беларуси сквозь призму научных исследований : докл. II Междунар. науч. конф., приуроч. к 95-летию Нац. акад. наук Беларуси. Минск, 29 сент. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Белорус. с.-х. б-ка им. И. С. Лупиновича, Ин-т истории, Научн. совет по кн. культуре, книгоизданию и б-кам Междунар. ассоц. акад. наук ; редкол.: Ю. О. Каракулько (отв. ред) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 11–24.

3. *Голубеў, В. Ф.* Новыя дакументы пра арганізацыю сацыяльна-эканамічнага жыцця ва ўладаннях князёў Сапег у канцы XVIII ст. (стварэнне сістэмы сельскіх судоў і рэгламентацыя абавязкаў сялянскіх дзесятнікаў) / В. Ф. Голубеў, А. Б. Доўнар // Соціально-економічні трансформації в Україні та Білорусі в XVI–XVIII ст.: фактор реформ. – Київ, Інститут історії України НАН України, 2016. – С. 207–230.

4. *Голубеў, В. Ф.* Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. – Мінск : Беларус. навука, 2008.

5. *Кітурка, І. Ф.* Заходнееўрапейскі вопыт у спробах мадэрнізацыі эканомікі ВКЛ у другой палове XVIII ст. / І. Ф. Кітурка // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2009. – № 4(55). – Ч. 1. – С. 97–104.

6. *Кітурка, І. Ф.* Да пытання пра ўжыванне тэрміну «мадэрнізацыя» адносна эканамічнага развіцця на землях Беларусі ў другой палове 18 ст. / І. Ф. Кітурка // Гістарычны альманах. – 2003. – № 9. – С. 47–56.

7. *Кітурка, І. Ф.* Мадэрнізацыя інстытутаў дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага ў другой палавіне XVIII ст. на прыкладзе стварэння дзяржаўнай мытнай службы / І. Ф. Кітурка // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава : зб. навук арт., прысвеч. 80-год. Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы і 65-год. гіст. адукацыі ў Гродзен. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы у 2 ч. – Ч. 1. – ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд), І. Ф. Кітурка (гал. рэд) [і інш.] – Гродна : ГрДУ, 2019. – С. 17–20.

8. *Кітурка, І. Ф.* Эканамічная літаратура другой паловы XVIII ст. аб неабходнасці і шляхах рэфармавання сельскай гаспадаркі Вялікага княства Літоўскага / І. Ф. Кітурка // Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі. – Вільня – Мінск: AIDAI – ATHENAEUM, 2009. – С. 162–168.

9. *Кітурка, І. Ф.* Дзяржаўная мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XVIII стагоддзя (1764–1795 гады) / І. Ф. Кітурка. – Гродна: ГрДУ, 2023.

10. *Китурко, И. Ф.* Укрепление экономической самостоятельности ВКЛ / И. Ф. Китурко // История белорусской государственности. В 5 т. – Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Бел. навука, 2018. – С. 503–525.

11. *Козловский, П. Г.* Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XVIII в. / П. Г. Козловский. – Минск : Наука и техника, 1974.

12. *Латышонак, А.* Да перыядызацыі гісторыі Беларусі ў эпоху мадэрнізацыі / А. Латышонак // Гістарычны альманах. – 2001. – Т. 4. – С. 109–126.

13. *Мацук, А. В.* Политические реформы и укрепление государственной власти / А. В. Мацук // История белорусской государственности. В 5 т. – Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Бел. навука, 2018. – С. 487–503.

14. *Похилевич, Д. Л.* Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века / Д. Л. Похилевич. – Вильнюс, 1966.

15. *Шыбека, З.* Нацыянальная мадэрнізацыя 19–20 стагоддзяў і яе асноўныя этапы / З. Шыбека // Гістарычны альманах. – 2002. – Т. 7. – С. 49–50.

16. Vilniaus Universiteto Bibliotekos Rankraščų Skyrius (VUB RS) – Бібліятэка Вільнюскага універсітэта, аддзел рукапісаў. – F. 57 – Б 53. Аддзел рукапісаў былой Віленскай публічнай бібліятэкі. Віленская капітула. – Bib. 172. Інвентар маёнткаў Убарцкага ключа 1785 г.
17. Volumina Legum. – T. VII. – Petersburg. Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860.
18. Zarys polskiej myśli ekonomiczno-rolniczej do drugiej wojny światowej / pod. red. A. Żabko-Potopowicza. – Wrocław – Warszawa – Kraków – Gdańsk, 1973.

УДК 930.1 (476)+316.422(476)

# МОДЕРНИЗАЦИЯ: ПОДХОДЫ К ОПРЕДЕЛЕНИЮ, СУЩНОСТЬ И ЭТАПЫ РАЗВИТИЯ В БЕЛАРУСИ

**С. Н. Ходин**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Khodzin@bsu.by*

В статье рассматриваются различные точки зрения, имеющиеся в историографии по отношению к определению понятия «модернизация», основные тенденции развития теории модернизации, предпринята попытка определить сущность модернизации, ее отличия от других процессов трансформации общества. Анализируются этапы советской модернизации в Беларуси, определяются их характерные черты. Особое внимание уделяется субъективному фактору модернизации, роли партийно-государственной элиты в генерации основных идей развития белорусского общества в различные периоды истории.

***Ключевые слова:*** модернизация; социальные формы модернизации; советская модернизация Беларуси; теория модернизации; П. А. Столыпин; Д. Ф. Прищепов; А. С. Славинский; К. Т. Мазуров; П. М. Машеров.

# MODERNIZATION: APPROACHES TO DEFINITION, ESSENCE AND STAGES OF DEVELOPMENT IN BELARUS

**S. M. Khodzin**

*Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030, Minsk, Khodzin@bsu.by*

The article examines the various points of view available in historiography in relation to the definition of the concept of “modernization”, the main trends in the development of the theory of modernization, an attempt is made to determine the essence of modernization, its differences from other processes of transformation of society. The stages of Soviet modernization in Belarus are analyzed, their characteristic features are determined. Special attention is paid to the subjective factor of modernization, the role of the party-state elite in generating the main ideas of the development of Belarusian society in various periods of history.

***Keywords:*** modernization; social forms of modernization; Soviet modernization of Belarus; modernization theory; P. A. Stolypin; D. F. Prishchepov; A. S. Slavinsky; K. T. Mazurov; P. M. Masherov.

Модернизация определяется как процесс направленных системных социальных изменений. Последние могут происходить на основе адаптации